# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

13 снежня 2017 г. №47 (431)




стар. 5

**Бюджэт вам у дапамогу**



стар. 4

**У вёску — па прычоску**



стар. 7

**Хто будуе без дазволу?**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ЗАМЕСТ «СПАТКАННЯ» — «ЛЕПІМ САМІ»

## Аб'екты грамадскага харчавання і гандлю пераводзяць у новы фармат



Работнікі бара «Ежа&Кава» прапануюць да 24 відаў кавы.

**За апошнія чатыры гады Міншчына зрабіла значны рывок у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва. І цяпер цэнтральны рэгіён наперадзе ўсіх абласцей па відах і аб'ёмах рэалізацыі бытавых паслуг. Шмат новага з'явілася і ў галіне спажывецкай кааперацыі. У прыватнасці, памянялася канцэпцыя работы гандлёвых аб'ектаў, у многіх райцэнтрах адкрыліся закусачныя «Лепім самі», у новым фармаце працуюць аб'екты прыдарожнага сэрвісу. Тон у навацыях задае Слуцкі раён. Туды і накіравалася наша карэспандэнт, каб усё пабачыць на свае вочы.**

стар. 4

УСЁ Ў ПАРАДКУ

# З ВІДАМ НА ЎТУЛЬНЫ ДВОР

## Карэспандэнт «МС» высвятляла сакрэты добраўпарадкавання магілёўскіх дворыкаў

**У Магілёўскім гарсавеце нядаўна дэпутаты вызначаліся з найлепшымі дварамі і пад'ездамі ў межах агляду-конкурсу па добраўпарадкаванні за гэты год. Спрэчкі вяліся не абы якія. Шмат добрых слоў прагучала ў адрас агульнага дворыка для дамоў 23, 25, 27 па вуліцы Якубоўскага. Ён стаў адным з прэтэндэнтаў на прызавое месца. Тут, адзначалі народныя абраннікі, вельмі добра выкарыстоўваецца і адміністрацыйны рэсурс, і работа з насельніцтвам. Стала цікава, ці сапраўды там так добра, як расказваюць, — вырашыла схадзіць паглядзець.**

### ПРЫГАЖОСЦЬ СВАІМІ РУКАМІ

Яшчэ здалёк убачыла маляўнічую пляцоўку з сучасным гульнявым абсталяваннем і некалькі маладых жанчын з дзецьмі. Пазнаёміліся бліжэй: Каця, Наташа і дзяўчына з прыгожым прыбалтыйскім імем Легіта. Усе яны з суседніх дамоў, а Легіта нават з суседняй вуліцы. Пакуль малыя гуляюць, гутарым пра ўтульныя двары. Мікрараёну Мір-2, лічаць яны, пашчасціла. Хай такая прыгажосць і не ў кожным двары, але ж у радыусе дасягальнасці. Дзецям тут сапраўды цікава — прасторныя пляцоўкі, сучаснае абсталяванне, казачныя героі.

Парадак на тэрыторыі падтрымлівае ЖЭУ №6. Яго начальнік Маргарыта Цітова, дарэчы, сама дэпутат гарсавета, а па сумяшчальніцтве намеснік старшыні Савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразоны №6. У гэтым ЖЭУ Маргарыта Аляксееўна працуе ўжо 14 гадоў, ведае тут кожнае дрэўца. Прызнаецца, што багаты вопыт дае ёй магчымасць аператыўна вырашаць усе пытанні.

стар. 8



Дворык на вуліцы Якубоўскага прыцягвае нават жыхароў з іншых вуліц.